# На сваёй Зямл

**19 красавіка ў масгацкай галерэі "Універсітэт культуры" і выставачнай зале Рэспубліканскага экалагічнага цэнтра дзяцей і юнацтва адкрылася VII Міжнародная выстаўка жывапісу і графікі "На сваёй Зямлі".**

Аўтары твораў — мастакі самых розных узростаў: ад трох-, чатырохгадовых дзетак да студэнтаў сярэдніх і вышэйшых навучальных установ. Экспазіцыя нагадвае своеасаблівае падарожжа ў часе, калі мастак робіцца Мастаком, што спасцігае сакрэт рамяства. V работах афармляецца ўласнае бачанне свету. Багатая палітра твораў, створаных аўтарамі розных краін — ад Беларусі і Расіі да Украіны, Польшчы і Грузіі, — захапляе шчырасцю эмоцый, зачароўвае непаўторным каларытам далёкіх і блізкіх мясцін, уражвае разнастайнасцю мастацкіх тэхнік і прыёмаў.

Выстаўку — амаль 500 твораў — арганізавала яе грамадская арганізацыя Беларусі "Зялёны Крыж" сумесна з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам адукацыі краіны Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

**Ул. інф.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ